*Сувалаў А. М.*

# Навуковыя пазіцыі Г. А. Хабургаева ў дыскусіі пра тэорыю балцкага субстрату В. В. Сядова ў канцы 60-х – пачатку 70-х гг. XX ст

Дыскусія, аб якой пойдзе гаворка, працякала на старонках агульнасаюзнага навуковага часопіса «Советская этнография» у канцы 60-х – пачатку 70-х гг. XX ст. Яна была выклікана публікацыямі поглядаў маскоўскага археолага В.В. Сядова адносна субстратнага ўплыву балцкага насельніцтва на этнагенетычныя працэсы ў Беларусі пры фарміраванні беларускай народнасці [4, с. 301–309]. У дыскусіі акрамя В.В. Сядова [5, с. 112–129; 6, с.105–121] і Г.А. Хабургаева [9, с. 85–99] удзельнічалі П.М. Трэцякоў [7, с. 110–118], В.А. Жучкевіч [3, с. 107–113] і М.Я. Грынблат [1, с. 79–92].

Удзел Георгія Аляксандравіча Хабургаева ў навуковай дыскусіі аб тэорыі балцкага субстрату Валянціна Васільевіча Сядова патрабуе, на наш погляд, асобнага разгляду. Яго публікацыя з'явілася апошняй па часе сярод змешчаных у часопісе «Советская этнография» дыскусійных матэрыялаў. Па гэтай прычыне яна была больш прадуманай, паколькі ўлічвала ацэнкі ўжо апублікаваных аргументаў яго папярэднікаў, падводзіла своеасаблівы вынік развaжанняў апанентаў тэорыі балцкага субстрату В.В. Сядова і вызначала асноўныя заўвагі крытыкаў з пазіцый,перш за ўсё,лінгвістыкі і логікі. Заўважым, што матэрыял Г.А. Хабургаева быў апублікаваны нават пасля паўторнага выступлення аўтара тэорыі балцкага субстрату В.В. Сядова, у якім апошні адказваў на навуковыя заўвагі сваіх апанентаў. Такім чынам, Г.А. Хабургаеў выступіў як свайго роду «апошняя інстанцыя» у азначанай дыскусіі.

Даследчык выдзяліў 6 асноўных блокаў аргументаў ці тэзісаў сваёй нязгоды як з высновамі тэорыі В.В. Сядова, так і з асобнымі палажэннямі яго крытыкаў. Трэба прызнаць вельмі трапнай яго заўвагу адносна дыскусіі на старонках «Советской этнографии», згодна з якой спрэчка ад абмеркавання «першапрычыны» утварэння беларусаў перайшла да высвятлення долі балцкага элемента ў лінгва-этнічнай своеасаблівасці беларускага народа [9, с. 86].

Сам даследчык аналізаваў матэрыялы па гісторыі, археалогіі, мовазнаўству і этнаграфіі. Неабходна памятаць, што Г.А. Хабургаеў у свой час прапанаваў канцэпцыю развіцця мовы ўсходніх славян, згодна з якой праўсходнеславянская мова не мела свайго адзінства. Самі дыялекты старажытнарускай мовы перыяду IX–XII стст., на яго думку, з'яўляліся спадчынай позднепраславянскай эпохі. Іншымі словамі кажучы, працэсы развіцця агульнастаражытных асаблівасцяў працякалі ва Ўсходняй Еўропе сярод першапачаткова неаднародных славянскіх дыялектаў.

Г.А. Хабургаеў, прызнаючы славянізацыю абарыгенаў [9, с. 87], сцвярджаў, што на «тэрыторыі Русі ў гістарычны час» мы сустракаем «толькі славянскую мову» [9, с. 87].

Наяўнасць пэўных агульных працэсаў у развіцці моў ўсходніх славян у перыяд, які савецкія даследчыкі адводзілі пад час існавання старажытнарускай народнасці, падавалася як ускосны доказ існавання апошняй.

Галоўны аргумент Г.А. Хабургаева пры апаніраванні поглядам В.В. Сядова – парушэнне апошнім логікі развіцця этнагенетычных працэсаў, што працякалі ў Беларусі. Пры гэтым галоўны аргумент В.В. Сядова аб супадзенні асноўных тэрыторый балцкай гідраніміі з археалагічнымі арэаламі, якія могуць быць звязаны са старажытнымі балтамі, даследчык прызнаваў вельмі пераканаўчымі [9, с. 87]. Г.А. Хабургаеў – прыхільнік ідэі славянскай каланізацыі Усходняй Еўропы [9, с. 87]. Да славянскага засялення тэрыторыя Беларусі была заселена балтамі. Таму, як і іншыя апаненты В.В. Сядова, Г.А. Хабургаеў не адмаўляў факт удзелу балцкага насельніцтва («аўтахтонаў Усходняй Еўропы») у этнічных працэсах, якія працякалі ў гэтым рэгіёне пасля прыходу сюды славян [9, с. 87]. Са спасылкаю на летапісы (у прыватнасці, на «Аповесць мінулых часоў») Г.А. Хабургаеў указваў на наяўнасць неславянскіх насельнікаў

Усходняй Еўропы, якія, на яго думку, па меншай меры на сярэдзіну XI ст. яшчэ выкарыстоўвалі ўласныя (неславянскія) мовы [9, с. 90]. Даследчык лічыў, што славянізацыя балцкага (як і фінскага) насельніцтва славянамі на тэрыторыі Беларусі «складае асноўны змест этнічнай гісторыі народаў Усходняй Еўропы ў перыяд стварэння і ўмацавання старажытнарускай дзяржавы»

[9, с. 87–88]. Апошняе сцвярджэнне рабілася са спасылкаю на сумесную працу А.А. Навасельцава, В.Ц. Пашуты, Л.Ул.Чэрапніна, В.П. Шушаніна і Я.М. Шчапава [2], а таксама на публікацыю П.М. Трэцякова [8]. Такім чынам, Г.А. Хабургаеў сыходзіў з меравання, што частка неславянскіх плямён ранейшай Усходняй Еўропы не была ўказана летапісцам на сярэдзіну XI ст. па прычыне іх славянізацыі на гэты час. Даследчык выказваў магчымае дапушчэнне і аб славянізацыі на гэты ж час і балцкага насельніцтва з захаваннем памяці пра балтыйскае (Г.А. Хабургаеў у сваёй публікацыі выкарытоўваў паняцце «балтыйскае» там, дзе іншыя ўдзельнікі дыскусіі выкарыстоўвалі «балцкае») паходжанне старажытнарускага насельніцтва Цэнтральнай лясной паласы [9, с. 90].

Г.А. Хабургаеў, з’яўляючыся прыхільнікам ідэі існавання старажытнарускай народнасці, крытыкаваў В.В. Сядова за тое, што апошні не высвятліў ці адпавядаюць «арэалы трох усходнеславянскіх народаў (у тым ліку і беларусаў) лакальным моўным і этнаграфічным арэалам старажытнарускага перыяду (да XIII–XIV стст.)» [9, с. 86]. Таму парушэннем логікі аўтарам тэорыі балцкага субстрату яго апанент лічыў тое, што В.В. Сядоў не прывёў доказаў чаму трэба атаясамліваць «верхнедняпроўскіх славян VIII–XII стст. з беларускай этналінгвістычнай агульнасцю» [9, с. 86]. Уласная логіка Г.А. Хабургаева састаяла ў тым, што балцкі субстрат можа разглядацца толькі для старажытнарускай народнасці, якую патрэбна змясціць паміж «асваеннем» славянамі балцкага субстрату і з’яўленнем беларускай народнасці.

Асноўнай знешняй прыкметаю этнаса Г.А. Хабургаеў (як і яго папярэднікі, напрыклад, Я.Ф. Карскі) прызнаваў мову [9, с. 85]. Засталася не зусім зразумелай пазіцыя даследчыка па праблеме таго, калі ж трэба храналагічна выдзяляць беларускую народнасць у якасці самастойна існуючага ўтварэння. У адным месцы ён ставіць пад сумненне выказванне В.В. Сядова аб XIII–XIV стст. як часе фарміравання адзінай славянскай народнасці – беларусаў [9, с. 92]. А ў іншым, ён сцвярджае, што XIV ст. – гэта час, калі ўжо існавалі шматлікія асаблівасці, якія пазней сталі беларускімі, украінскімі і велікарускімі [9, с. 96]. Праўда,у апошнім сцвярджэнні Г.А. Хабургаеў асобна агаворвае, што ўказаныя асаблівасці не

адлюстроўвалі межаў будучых усходнеславянскіх этнамоўных комплексаў і толькі ўтрымлівалі патэнцыяльныя магчымасці для ўтварэння якасна іншых лінгва-этнічных адзінак (як у тэрытарыяльных, гэтак і ў колькасных адносінах). І, такім чынам, ні аб ніякіх беларусах, украінцах і велікарусах да XIV ст. не можа быць гаворкі [9, с. 96].

В.В. Сядоў не лічыў, што палітычны і эканамічны фактары сталі першай прычынай утварэння беларускай мовы і народнасці. Менавіта балцкі субстрат стаў, на яго думку, асноўнай прычынай выдзялення беларускай народнасці ў самастойнае этнічнае ўтварэнне. Лагічнай заўвагай Г.А. Хабургаева стала неабходнасць разгляду такога складанага працэсу як утварэнне асобнай народнасці як комплекснай, а не аднафактарнай праблемы [9, с. 92]. Хаця на гэтай жа старонцы сам жа Г.А. Хабургаеў безапеляцыйна сцвярджае, што накірунак этнічнага і моўнага развіцця, які супярэчыў тэндэнцыям папярэдняга перыяду, быў рэзка зменены «добра вядомымі палітычнымі зменамі – захопам Літвою і Польшчаю заходніх і паўднёва-заходніх замель … Русі» [9, с. 96–97]. Такім чынам, менавіта палітычны фактар вызначаўся даследчыкам галоўнай падставаю, або вызначальным момантам фарміравання беларускай народнасці.

Пры аналізе далейшай гісторыі развіцця этнічных працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай Г.А. Хабургаеў паміма палітычнага фактара дадае і «эканамічнае абасабленне заходнерускіх зямель» [9, с. 97]. Але і пры гэтым галоўная роля ў фарміраванні беларускай народнасці адводзілася ім палітычнай гісторыі рэгіёна [9, с. 97–98]. Г.А. Хабургаеў імкнуўся суаднесці пэўныя асаблівасці этнічнай гісторыі Усходняй Еўропы з вядомымі на той жа час археалагічнымі культурамі, што, безумоўна,было цікава, але не дадавала яго аргументам дадатковай вагі.

Такім чынам, Г.А. Хабургаеў пагаджаўся з асноўнымі доказамі ўдзелу даславянскага насельніцтва ў этнагенетычных працэсах на тэрыторыі Беларусі, але разглядаў балтаў у якасці аднаго са складаючых элементаў фарміравання старажытнарускай народнасці. Ён прызнаваў неаднароднасць як самой старажытнарускай народнасці, так і наяўнасць рэгіянальных асаблівасцяў старажытнарускай мовы. Этнагенетычныя працэсы

падаваліся ім як складаны і комплексны працэс, таму і выдзяленне балтаў у якасці галоўнага фактару, які прывёў да выдзялення адной з усходнеславянскіх народнасцей, – беларусаў, – ён лічыў недахопам тэорыі В.В. Сядова.У сваю чаргу, вызначальным фактарам распадзення старажытнарускай народнасці ён называў палітычнае адасабленне частак старажытнай Русі і іх уключэнне ў розныя палітычныя ўтварэнні.

**Літаратура**

1. Гринблат, М.Я. К происхождению белорусской народности (по поводу теории субстрата) / М.Я. Гринблат // Советская этнография. – 1968. – № 5. – С. 79–92.
2. Древнерусское государство и его международное значение. – М., 1965.
3. Жучкевич, В.А. К вопросу о балтийском субстрате в этногенезе белорусов / В.А. Жучкевич // Советская этнография. – 1968. – № 1. – С. 107–113.
4. Седов, В.В. О происхождении белорусов / В.В. Седов // Древности Белоруссии: материалы конф. по археологии Белоруссии и смежных территорий / Акад. наук БССР, Отд-ние обществ. наук, Ин-т истории; под ред.: В.Ф. Исаенко [и др.]. – Минск, 1966. – С. 301–309.
5. Седов, В.В. К происхождению белорусов (проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов) / В.В. Седов // Совет. этнография. – 1967. – № 2. – С. 112–129.
6. Седов, В.В. Еще раз о происхождении белорусов / В.В. Седов // Советская этнография. – 1969. – № 1. – С. 105–121.
7. Третьяков, П.Н. Восточные славяне и балтский субстрат / П.Н. Третьяков // Советская этнография. – 1967. – № 4. – С.110–118.
8. Третьяков, П.Н. У истоков древнерусской народности / П.Н. Третьяков. – Л., 1970.
9. Хабургаев, Г.А. Этнический состав Древнерусского государства и образование трех восточнославянских народностей (логические и линвистические замечания к обсуждению «первопричины» образования белорусской народности) / Г.А. Хабургаев // Совет. этнография. – 1972. – № 1. – С. 85–99.